щему его ландшафту, близкие человеку пропорции, свободное внутреннее пространство, натуральные материалы. Использование данного термина для архитектурных направлений, возникших практически на 70 лет позже не правомерно и создает путаницу при исследовании как органической архитектуры, так и иных природоориентированных и экологических направлений.

**Литература**


1. *Иконников, А. В.* Архитектура XX века. Утопии и реальность (в 2 т.). – М.: Прогресс – традиция, 2001. – 655 с.
2. *Орельская, О. В.* Современная зарубежная архитектура/ О. В. Орельская. – М.: Академия, 2006 г. – 272 с.
3. *Райт, Ф. Л.* Будущее архитектуры/ Ф.Л. Райт. – М: Государственное издательство литературы по строительству, архитектуре и строительным материалам, 1960. – 247 с.
4. *Pearson, D.* New organic architecture. The breaking wave/ David Pearson. – Los Angeles: University of California Press, 2001. – 223 c.
5. *Sullivan, L. H.* The Autobiography of an idea/ L. H. Sullivan. – New York.: Press of American Institute of Architects, 1924. – 330 c.


## ПАЎСТАННЕ 1863–1864 гг. У ПІНСКІМ ПАВЕЦЕ


**Д. У. Лішай**


Актуальнай тэмай для вывучэння застаецца паўстанне 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі. У цяперашні час комплексная навуковая работа па гэтай праблематыцы адсутнічае. Адным з магчымых вырашэнняў такога становішча можа стаць глыбокае даследаванне рэгіянальных асаблівасцей паўстання. Разнастайныя аспекты падзей 1863–1864 гг. у Пінскім павеце Мінскай губерні адлюстраваны ў работах А. Смірнова [12], В. Зайцава [2], А. Філатавай [13], А. Карповіча [4], Д. Матвейчыка [5; 6]. Разглядаючы гэту тэму, мэтазгодна звярнуцца да ўспамінаў камісара Падляшскага ваяводства Р. Рагінскага [3], расійскага генерал-маёра І. Носціца [10]. Апісанне планаў інсургентаў і баявых дзеянняў бакоў прысутнічае ў шэрагу апублікаваных матэрыялаў [1; 7; 11]. Змест тэрміновых мер, якія прымаліся расійскімі ўладамі для падаўлення ўзброенага выступлення на тэрыторыі Пінскага павета, прадстаўлены ў архіўных дакументах [8; 9]. Варта падкрэсліць, што больш поўнае раскрыццё спецыфікі паўстання неабходна праводзіць як праз вывучэнне дзейнасці інсургентаў, так і праз разгляд палітыкі расійскіх улад.

Неадназначная сітуацыя з арганізацыяй узброенага выступлення склалася ў Пінскім павеце, дзе інсургенты не разлічвалі на перспектыўнасць развіцця паўстання. Гэта тлумачылася адсутнасцю падтрымкі з боку мясцовага насельніцтва [1, с. 93–94]. Аднак у Пінскім павеце

адзначыліся дзейнасцю атрады Р. Рагінскага, Р. Траўгута і К. Нарбута, якія прыходзілі з іншых тэрыторый.

Значнай падзеяй паўстання 1863–1864 гг. стаў працяглы рэйд атрада Р. Рагінскага. У лютым 1863 г. яго фарміраванне перайшло з Пружанскага павета ў Пінскі. Камісар Падляшскага ваяводства планаваў авалодаць Пінскам. Аднак непадрыхтаванасць мясцовага насельніцтва да ўзброенага выступлення прымусіла інсургентаў адмовіцца ад атакі на горад [3, с. 449–450]. На гэта рашэнне паўплывалі і актыўныя дзеянні расійскіх улад. Каб не дазволіць паўстанцам Р. Рагінскага паўтарыць поспех акцыі ў Пружанах, да Пінска былі накіраваны рэгулярныя войскі [10, с. 571]. Перахапіўшы паштовую эстафету і грашовыя сродкі, атрад накіраваўся да Слуцка. [3, с. 450]. 26 лютага 1863 г. каля мястэчка Боркі Пінскага павета 2 роты Рэвельскага палка і 70 казакоў атакавалі фарміраванне Р. Рагінскага. Паўстанцам было нанесена паражэнне [13, с. 57]. Для атрада камісара Падляшскага ваяводства гэта стала апошнім узброеным сутыкненнем. Затым інсургенты Р. Рагінскага накіраваліся да мястэчка Тураў Мазырскага павета [3, с. 451].

22 лютага 1863 г. Пінскі павет быў аб'яўлены на ваенным становішчы. Яго ваенным начальнікам стаў палкоўнік А. Кірпічоў [8, арк. 27–27 адв.]. 25 сакавіка 1863 г. гэту пасаду заняў камандзір Палтаўскага рэзервовага батальёна палкоўнік Д. Назімаў [9, арк. 5–5 адв.].

У чэрвені 1863 г. аднавілася актыўная фаза ўзброенай барацьбы паўстанцкіх атрадаў з рэгулярнымі расійскімі войскамі. Атрад Р. Траўгута, які не змог працягнуць сваю дзейнасць у Кобрынскім павеце, ажыццяўляў пераход праз Пінскі павет у Валынскую губерню. Гэта фарміраванне праследавалі расійскія войскі [5, с. 70]. Так, 17 чэрвеня 1863 г. атрад Палтаўскага рэзервовага пяхотнага палка пад камандаваннем паручніка М. Пятроўскага ўступіў у бой з інсургентамі Р. Траўгута, якія размясціліся ў Альтанаўскай пушчы. Паўстанцы аказалі супраціўленне, але былі вымушаны адступіць [11, с. 432]. 18 чэрвеня 1863 г. інсургенты перайшлі праз раку Гарынь і накіраваліся да мястэчка Столін Пінскага павета. Аднак фарміраванне Р. Траўгута было зноў атакавана расійскімі войскамі, якімі камандаваў падпалкоўнік Палтаўскага рэзервовага пяхотнага палка Л. Пляшкоў. Паўстанцы пацярпелі паражэнне [11, с. 433]. 19 чэрвеня 1863 г. каля мызы Калоднае Пінскага павета 20-я рота Палтаўскага рэзервовага пяхотнага палка і 28 стралкоў разбілі фарміраванне Р. Траўгута [11, с. 434]. Ацаніўшы складанае становішча атрада, Р. Траўгут падзяліў яго на групы, асабіста ўзначаліўшы 20 інсургентаў. У хуткім часе ён наведаў маёнтак Э. Ажэшкі ў Людвінава, адкуль накіраваўся да мяжы Царства Польскага [13, с. 58].

З 19 чэрвеня 1863 г. у Пінскім павеце пачаў дзейнічаць паўстанцкі атрад К. Нарбута, які перайшоў з Кобрынскага павета. Гэта фарміраванне налічвала 65 чалавек [11, с. 435]. 21 чэрвеня атрад 3-й стралковай роты Пскоўскага пяхотнага палка і 20 казакоў атакавалі інсургентаў К. Нарбута каля вёскі Жытнавічы Пінска павета. Паўстанцы былі вымушаны адступіць [11, с. 436]. Затым атрад К. Нарбута з'явіўся ў фальварку Сенчыцы Пінскага павета, дзе яго ўдзельнікі рэквізавалі коней, павозкі і фураж у арандатара А. Лявіцкага [11, с. 437]. Далей паўстанцы накіраваліся ў Ковельскі павет Валынскай губерні. Сутыкнуўшыся з атрадам стралковай роты Чарнігаўскага палка і 20 казакамі, фарміраванне К. Нарбута перайшло ў Брэсцкі павет [11, с. 438].

Такая актывізацыя ўзброенай барацьбы ў Пінскім павеце не засталася па-за ўвагай расійскіх улад. Таму 30 чэрвеня 1863 г. на пасаду ваеннага начальніка павета быў прызначаны палкоўнік З. Вярхоўскі [9, арк. 11–11 адв.].

У пачатку жніўня 1863 г. на мяжы Слонімскага і Пінскага паветаў расійскімі ўладамі было зафіксавана з'яўленне чарговага паўстанцкага фарміравання. Яго камандзірам, як лічыць даследчык Д. Матвейчык, быў Ф. Юндзіла. Для ліквідацыі атрада выступілі рэгулярныя войскі. Паўстанцы не змаглі дзейнічаць на тэрыторыі Пінскага павета, бо пацярпелі паражэнне [7, с. 301–302; 11, с. 439].

Варта адзначыць, што інсургенты не мелі шырокай падтрымкі з боку мясцовага насельніцтва. Калі ўлічыць агульную колькасць рэпрэсаваных асоб у Мінскай губерні, то на долю Пінскага павета прыпадае 5,62% пакараных [2, с. 110].

Такім чынам, паўстанне 1863–1864 гг. у Пінскім павеце характарызавалася шэрагам асаблівасцей. Нягледзячы на адсутнасць мясцовых фарміраванняў інсургентаў, у баявых дзеяннях на яго тэрыторыі прынялі ўдзел атрады Р. Рагінскага, Р. Траўгута і К. Нарбута. Аднак насельніцтва Пінскага павета не было падрыхтавана да ўзброенага выступлення. Паўстанцкія фарміраванні пастаянна манеўравалі, раздзяляліся на групы, якія не маглі дзейнічаць эфектыўна. Расійскія ўлады былі вымушаны аб'яўляць Пінскі павет на ваенным становішчы, выкарыстоўваць рэгулярныя войскі для падаўлення ўзброенага выступлення інсургентаў, праводзіць змены ваенных начальнікаў.

**Літаратура**

1. Восстание 1863–1864 гг. в Литве и Белоруссии: сборник документов / редкол.: В. Дьяков, В. Жигалов, Ю. Жюгжда [и др.]. – Мн.: Наука, 1965. – 586 с.
2. *Зайцев В. М.* Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа). – М.: Наука, 1973. – 230 с.

3. Из воспоминаний повстанца // Исторический вестник. – 1906. – Т. 105. – С. 422–452.
4. *Карпович О. В.* Рейд отряда Романа Рогинского по Беларуси зимой 1863 года / О.В. Карпович // Весн. Полоцк. госуд. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2013. – №1. – С. 37–41.
5. *Матвейчык Д. Ч.* Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў / Д.Ч. Матвейчык. – Мн.: Медысонт, 2013. – 122 с.: іл.
6. *Матвейчык Д. Ч.* Уладзіслаў Машэўскі і спроба ўзброенага выступлення ў Слуцкім павеце ў 1863 г. / Д.Ч. Матвейчык // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: В.В. Яноўская [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; – Мн., 2014. – С. 79–92.
7. *Миловидов А. И.* Архивные материалы Муравьёвского музея, относящихся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края. Кн. VI, ч. 2. Переписка о военных действиях с 10 января 1863 г. по 7 января 1864 г. – Вильно, 1915. – 460 с.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1517а. Перапіска з кіраваннем віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва, мінскім ваенным губернатарам, павятовымі ваеннымі начальнікамі аб прызначэнні павятовых ваенных і станавых начальнікаў следчых камісій і расходах на іх утрыманне. 1863–1864 гг.
9. НГАБ. – Фонд 299. – Воп. 2. – Спр. 5976. Справа аб прызначэнні ваенных начальнікаў па паветах Мінскай губ. у сувязі з увядзеннем ваеннага становішча ў перыяд паўстання 1863 г. 1863–1868 гг.
10. *Ностиц И. Г.* Из воспоминаний графа И.Г. Ностица о польском восстании 1863 года – [Москва: Университетская типография, 1900.] – С. 559–571.
11. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях: Дакументы і матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі / уклад. Дз.Ч. Матвейчык; рэдкал.: У.І. Адамушка [і інш.]; – Мн.: А.М. Вараксін, 2014. – 544 с.
12. *Смирнов А. Ф.* Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии / А.Ф. Смирнов. – М.: АН СССР, 1963 г. – 391 с.
13. *Філатава А.* З хронікі баявых сутычак паўстанцаў / А. Філатава // Беларус. гіст. часоп. – 1993. – №3. – С. 54–60.

# ДАБРАЧЫННЫЯ ТАВАРЫСТВЫ Ў ПАЎСЯДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ РАБОЧЫХ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## Я. В. Маслоўскі

Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Віцебскай губерні ўзнікла і існавала вялікая колькасць дабрачынных і грамадскіх арганізацый, якія аказвалі моцны ўплыў на жыццё тагачасных рабочых губерні. Дабрачынныя таварыствы былі прадстаўлены ў розных сферах: дзіцячыя садкі-яслі, таварыствы беспрацэнтнага крэдыту, пахавальныя таварыствы і іншыя. Падобная сітуацыя тлумачыцца тым, што ў